Дзяржаўная ўстанова культуры
«Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
Цэнтральная раённая бібліятэка

# Іх імёнамі названы вуліцы аграгардка Германавічы

***Пошукава-даследчая праца***

Падрыхтавала: Шышко В.У.,
намеснік дырэктара

Германавічы, 2025 год



# ЗМЕСТ

| | |
|---|---|
| Уводзіны…………………………………………………………………….. | 3 |
| I. Фарміраванне палка……………………………………………………… | 4 |
| Вызваленне вёскі Германавічыад нямецка-фашысцкіх захопнікаў……….. | 6 |
| II.Іх імёнамі названы вуліцы Германавіч……………………………………. | 10 |
| Міхаіл Аляксеевіч Дзерабін……………………………………………….. | 10 |
| Сяргей Міхайлавіч Прохараў………………………………………………… | 11 |
| Макар Іванавіч Клюйко……………………………………………………… | 13 |
| Заключэнне………………………………………………………………… | 15 |
| Спіс літаратуры…………………………………………………………….. | 16 |
| Дадатак………………………………………………………………………… | 17 |

# УВОДЗІНЫ

Вялікая Айчынная вайна... Ва ўсіх нас яна асацыіруецца з болем, жахам і смерцю. Чатыры гады, 1418 дзён, ішла па нашай зямлі самая кравапралітная вайна ў гісторыі чалавецтва. У ёй наш народ здзейсніў велічны подзвіг.

Вельмі мала сёння засталося ветэранаў. Большасць з іх пайшлі з жыцця, але памяць аб салдатах Вялікай Айчыннай вайны застаецца ў нашых сэрцах.

Шаркаўшчынскі раён вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў войскамі першага Прыбалтыйскага фронту ў ходзе аперацыі «Баграціён» (Полацкай наступальнай аперацыі 29 чэрвеня – 4 ліпеня 1944 года). У баявых дзеяннях непасрэдна ў нашай мясцовасці прымаў удзел 1406 зенітна-артылерыйскі полк, які быў у складзе 166-й стралковай дывізіі (2-гі гвардзейскі корпус 6-й гвардзейскай арміі) [2, с. 287].

Дом маіх бацькоў знаходзіцца літаральна ў двух кроках ад таго месца, дзе 1 ліпеня 1944 года быў размешчаны камандны пункт 1406 зенітна-артылерыйскага палка, які ўдзельнічаў у вызваленні вёскі Германавічы ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Тут зенітчыкі здабылі сабе славу, калі, не шкадуючы жыццяў, грамілі ненавіснага ворага.

Як сведчанне гэтаму абеліск ў цэнтральным парку аграгарадка, сквер-мемарыял у гонар зенітчыкаў, якія вызвалялі нашу мясцовасць ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

У Шаркаўшчыне, у скверы, стаіць абеліск, на якім высечаны прозвішчы воінаў, якія загінулі, вызваляючы наш раён ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, сярод іх, у другім радку – капітан Макар Іванавіч Клюйко.

Імёнамі вызваліцеляў названыя тры вуліцы нашай вёскі. Гэта вуліцы: М.І.Клюйко, С.М.Прохарава, М.А.Дзерабіна. Гэтыя вуліцы заўсёды зялёныя, усаджаныя дрэвамі, кустамі і кветкамі. Амаль ля кожнай хаты чысціня і парадак. Нярэдка сустрэнеш на вулачцы штучны вадаём. Доўгі час адна з вуліц называлася Зялёная, але ў 1989 годзе стала насіць імя Міхаіла Аляксеевіча Дзерабіна. У гонар Макара Іванавіча Клюйко названа новая вуліца аграгарадка, а імя Сяргея Міхайлавіча Прохарава носіць былая вуліца Маладзёжная.

Кожны год 1 верасня на першым уроку вучні Германавіцкай сярэдняй школы праводзяць экскурс у мінулае, наведваючы месцы бою 1406 ЗАП у вёсцы Германавічы, дзе вялі ў 1944 годзе бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі гэтыя мужныя воіны. Ім я прысвячаю сваю пошука-даследчую працу.

# І. ФАРМІРАВАННЕ ПАЛКА

1406 зенітна-артылерыйскі полк пачаў фарміравацца ў пасёлку «ЗІС» каля Масквы з красавіка 1943 года. Першыя клопаты прыняў на сябе энергічны, здольны начальнік штаба палка Джэрыеў Дзмітрый Георгіевіч. У далейшым фарміраванне палка ў складзе 39-й зенітна-артылерыйскай дывізіі прадаўжалася пад Масквой у горадзе Краснагорску, але і тут пункт для фарміравання не быў канчатковым. Фарміраванне палка было перанесена ў Ахуны, каля горада Пензы. У чэрвені сюды быў накіраваны намеснік камандзіра палка па палітычнай частцы капітан Кантаністы Грыгорый Герасімавіч.

У ліпені прыбыла вялікая група афіцэраў, сяржантаў і радавога складу, былі ўкамплектаваны падраздзяленні і штаб, арганізавана баявая падрыхтоўка. Увесь асабовы склад жыў лагерам у зямлянках. 6-7 жніўня 1943 года полк атрымаў усю матэрыяльную частку і боепрыпасы. Асабовы склад палка пачаў узмоцнена вывучаць атрыманую тэхніку. Займаліся па 10 гадзін у суткі. Апрача гэтага выконваліся розныя гаспадарчыя работы.

Кантынгент афіцэрскага саставу быў галоўным чынам з удзельнікаў Айчыннай вайны. Сяржанцкі і радавы склад у большасці сваёй – з маладога пакалення, якое не было на фронце, 1925 года нараджэння і невялікай групы ўдзельнікаў вайны. Зенітчыкаў сярод радавога складу не было. Нізкі ўзровень адукацыі, падрыхтоўкі характарызаваў асноўную масу радавых, што складала выключныя цяжкасці ў навучанні і выхаванні воінаў.

7 жніўня 1943 года прыбыў і ўступіў у камандаванне палком Іван Аляксандравіч Сазонаў. На нарадзе афіцэраў камандзірам палка была пастаўлена галоўная задача – устанаўленне моцнай воінскай дысцыпліны і арганізаванасці ва ўсіх падраздзяленнях палка, таму што без гэтага немагчыма паспяхова вырашаць задачы баявой падрыхтоўкі, фарміравання падраздзяленняў і палка ў цэлым.

З 10 жніўня 1943 года пачалася паспяховая баявая падрыхтоўка радавога, сяржанцкага і афіцэрскага складу ўсіх ступеняў, прыкметна былі падцягнуты дысцыпліна і арганізаванасць, якая ў сілу разнароднага па сваёй падрыхтоўцы і выхаванню патрабавала лепшага.

Большасць афіцэраў была ўпершыню на сваіх пасадах, не мела дастатковых ведаў і вопыту.

У пачатку фарміравання палка асноўны кіруючы касцяк афіцэраў на пасадах быў наступны: камандзір палка І.А.Сазонаў, намеснік камандзіра палка па палітчасці капітан Кантаністы, начальнік штаба палка Джэрыеў, памочнік начальніка штаба гвардзіі старшы лейтэнат М.І. Клюйко, памочнік камандзіра палка па матэрыяльна-тэхнічнаму забеспячэнню лейтэнант М.В.Рэвякін, начальнік артылерыйскага забеспячэння лейтэнант В.В.Гусеў, начальнік ВТЗ палка капітан Мамедаў, начальнік санітарнай службы ваенны ўрач 3-га рангу Гіравенка і іншыя.

Камандаванне 1406 зенітна-артылерыйскага палка:

Камандзір палка – Сазонаў Іван Аляксандравіч

Намеснік камандзіра палка – Арзуманаў Аркадзь Місропавіч
Парторг палка – Дзерабін Міхаіл Аляксеевіч
Камсорг палка – Маскавец Іван Міхайлавіч
Камсорг палка – Крэмез Міхаіл Васільевіч
Зампаліт палка – Кантаністы Грыгорый Герасімавіч
Начальнік штаба палка – Нізоўцаў Анатоль Іванавіч
Начальнік разведкі палка – Тозікаў Пётр Грыгор евіч
Камандзір першай батарэі – Ламачэўскі Пётр Васільевіч
Камандзір другой батарэі – Прохараў Сяргей Міхайлавіч
Камандзір трэцяй батарэі – Анціпаў Васіль Паўлавіч
Камандзір чацвёртай батарэі – Дварэцкі Цімафей Севасцьянавіч

Да кастрычніка 1943 года было завершана фарміраванне палка. Гарматныя разлікі прапушчаны праз вучэбную баявую стральбу. Камісія вучэбнага цэнтра вайсковай зенітнай артылерыі, якая правярала баявую падрыхтоўку палка ў сваім акце адзначыла добрую падрыхтоўку гарматных разлікаў і іншых спецыялістаў. У хуткім часе быў атрыманы вадзіцельскі састаў, які на 60% складаўся з маладога папаўнення і яшчэ не меў практыкі ваджэння. Былі атрыманыя новыя аўтамашыны іншаземных марак: 20 «Студэбекераў», 13 «Доджаў» і 1 «Віліс». Увесь вадзіцельскі склад гэтых машын не ведаў. Яшчэ горш, што большасць шафёраў была малога росту, нагамі не даставалі да педаляў, а вялізны руль машыны быў на ўзроўні ці вышэй галавы вадзіцеля. Прыйшлося тэрмінова вучыць вадзіцельскі састаў і рабіць некаторыя прыстасаванні ў кабіне. Такія вадзіцелі зрабілі некалькі аварый і паломак, тым самым стварылі нямала клопатаў, аднак яны вельмі добрасумленна выконвалі свой доўг, аддаючы ўсё, што маглі, а частка іх у далейшым сталі добрымі вадзіцелямі і вызначыліся ў сваёй працы, за што былі адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі.

Камандзір палка Сазонаў Іван Аляксандравіч успамінае: «13 кастрычніка 1943 года – гістарычны дзень! З пад'ёмам полк як патурбаваны мурашнік. Пасля снедання – урачыстае пастраенне. Палку ўручаецца баявы Чырвоны сцяг часці. Да 17.00 загрузілі аўтамашыны боепрыпасамі, тэхнікай. Усе атрымалі асабістую зброю. Полк у страі з распасцёртымі сцягамі. Тут жа калона аўтамашын з гарматамі. Гляджу на салдат, слухаю іх узнёслыя словы, перакананы: з такімі людзьмі мы дакацім свае гарматы і на руках, без машын.

Пасля некалькіх выступленняў, запланаваных Кантаністым, папрасілі слова яшчэ некалькі салдат і афіцэраў! У выказваннях рашучасць б'е ключом. Лічу сябе шчаслівым, што маю гонар весці такіх патрыётаў у бой. Справа за мной. Яны на мяне спадзяюцца, чакаюць прыклада адвагі, мужнасці, кемлівасці, умення гібка кіраваць палком у складаных баявых умовах». Так пачынаўся баявы шлях палка, які прайшоў з баямі ўсю беларускую зямлю і ўдзельнічаў у вызваленні Прыбалтыкі.

Адзін з яскравых эпізодаў гісторыі 1406 ЗАП – бой з авіяцыяй праціўніка ў вёсцы Германавічы.

# ВЫЗВАЛЕННЕ ВЁСКІ ГЕРМАНАВІЧЫ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ АКУПАНТАЎ

Раніцай 1 ліпеня 1944 года камандзір 1406 ЗАП Сазонаў І.А. атрымаў ад камандуючага артылерыяй другога гвардзейскага стралковага корпуса баявы загад: «Як мага хутчэй і надзейна прыкрыць праход часцей стралковага корпуса праз мост мястэчка Германавічы ад уздзеяння авіяцыі праціўніка". Дадаткова паведамлялася, што няма дадзеных аб тым, у чыіх руках знаходзіцца мост праз раку Дзісна, таму магчымыя былі сутыкненні з адыходзячым праціўнікам ці яго ар'ергардам.

Па трывозе полк зняўся з займаемых пазіцый у раёне Тупічына-Спікалоўшчына, абганяючы часці на маршу, накіраваўся да пераправы.

Камандзіры батарэй атрымалі ад камандзіра 1406 ЗАП загад: «Рухацца з максімальна магчымай хуткасцю, абганяючы ўсіх». Паставіўшы паслядоўна задачу кожнаму камандзіру батарэі і адправіўшы батарэі, Сазонаў І.А. выехаў наперад на асабістую разведку аб'екта і маршрута, пры гэтым абагнаў калоны батарэй. На падыходзе да мястэчка Германавічы ў камандзіра 166 гвардзейскай стралковай дывізіі даведаўся, што мост цэлы, але знаходзіцца пад кантролем адступаючага праціўніка.

На ўзмацненне перадавога атрада камандзір палка Сазонаў І.А. адразу выслаў другую батарэю і зенпульроту пад агульнай камандай капітана Клюйко М. І. з задачай ва ўзаемадзеянні з перадавым атрадам заняць агнявыя пазіцыі непасрэдна каля маста на супрацьлеглым беразе...

У Германавічах камандзір батарэі капітан Прохараў пад прыкрыццём агню зенпульроты капітана Плевінскага разам з пехацінцамі хутка праскочыў з батарэяй праз мост і з калёс адкрыў агонь па ворагу. Такім чынам, фашысты, якія абаранялі мост, былі забіты дзёрзкімі, рашучымі дзеяннямі другой батарэі і байцамі перадавога атрада. Тут ва ўсім бляску праявілася мужнасць камандзіра і салдат батарэі.

Праціўнік пад націскам авангардаў 2-га гвардзейскага стралковага корпусу адышоў на паўночны бераг ракі Дзісна і сваімі ар'ергардамі імкнуўся замацавацца на фронце Шышкі-Падоршчыца-Атокі-Дзікева-Сталіца-Баяры.

Перадавыя часці 2-га гвардзейскага стралковага корпуса, паспяхова выйшлі на паўночны бераг ракі Дзісна, завязалі баі з ар'ергардамі ворага.

Разведаўшы раён баявога парадку і самога аб'екта, камандзір палка прыйшоў да вываду: уверх і ўніз па цячэнні ракі Дзісна ад мястэчка Германавічы на адлегласці дзясятка кіламетраў няма ніякіх мастоў і броду. Мост, хаця і невялікі па памерах, з'яўляецца важным аб'ектам абароны і ў выніку гэтага безумоўна будзе падвергнуты нападзенню авіяцыі праціўніка, пры гэтым з невялікай вышыні. Улічваючы невялікую прапускную здольнасць маста і верагоднасць скаплення ў мястэчку войск і тэхнікі на шашы, было вырашана размясціць баявы парадак, стварыўшы максімальна магчымую шчыльнасць агню над мастом.

Чатыры батарэі 1406 ЗАП, абагнаўшы 166-ю стралковую дывізію, прыдадзеныя часці і некалькі аўтакалон з ходу ў 1300 метраў занялі ўказаныя раёны агнявой пазіцыі (АП) і, не паспеўшы яшчэ вывесці з АП аўтамашыны, былі вымушаны адбіваць групы самалётаў ФВ-190, якія спрабавалі атакаваць падыходзячыя калоны войск і знішчыць пераправу.

Дзейнічалі хутка: тэлефаністы цягнулі правады ў раёны агнявых пазіцый, штаб развярнуўся каля будынка школы, а камандны пункт абсталявалі каля дарогі. Улічваючы малы па памерах аб’ект абароны – мост, меркавалі, што бамбіць яго будуць толькі з пікіравання. Таму батарэі размясцілі на вельмі маленькіх інтэрвалах з тым, каб можна было весці агонь па любой цэлі, з любога накірунку адначасова ўсім палком.

У той дзень надвор’е было яснае, на небе – ніводнай хмаркі. Паўсюдна разлілася цішыня.

Прывялі палонных, якія былі захоплены пехацінцамі ў баі за мост. Палонныя паказалі, што мелі задачу стрымліваць рускіх да наступлення цемры, а затым узарваць мост і адысці ў мястэчка Шаркаўшчына. Тут было ціха, баі ішлі каля Шаркаўшчыны. У 12 гадзін уздоўж ракі праляцелі два Ме-109, скінулі на мост дзве бомбы, не трапілі ў цэль, паляцелі.

Надвячоркам да штаба палка падкаціла кухня з пахам смачнай стравы. Салдаты і афіцэры размясціліся непадалёку ад машыны штаба палка, каб падсілкавацца. Сюды ж з двума машынамі боепрыпасаў пад’ехаў лейтэнат Гусеў і папрасіў камандзіра, каб той дазволіў яму спачатку паабедаць, а потым даставіць боепрыпасы ў батарэі. Іншай каманды здавалася і быць не магло, бо тры дні салдаты і афіцэры не мелі гарачага харчавання. Камандзір загадаў: «На абед 10 хвілін». Потым ён зразумеў, што гэта была памылка.

… Артзабеспячэнцы хутка скінулі некалькі скрынь з боепрыпасамі на зямлю, каб выкарыстаць іх замест сталоў.

У 20 гадзін 30 хвілін назіральнік неймаверным крыкам апавясціў: «Паветра!». Усе ўскочылі і пахавалі лыжкі за галянішчы. «Па месцах!», – гучыць каманда камандзіраў усіх ступеняў. Гэта ідзе дубліраванне загада камандзіра палка.

У паветранай прасторы плыве грамада чорных кропак і, здаецца, ім няма канца. Сазонаў хватае тэлефон і загадвае: «Усім!» Наводзіць у галаўны самалёт! Агонь па маёй камандзе! ».

Батарэі былі гатовы і чакалі загаду на адкрыццё агню. Самалёты выстрайваюцца па тры ў кільватарную калону і пачынаюць ланцужком заходзіць для бомбамятання на мост. Сорак ствалоў трымаюць пад прыцэлам вядучы самалёт, і ў момант найбольш спрыяльны Сазонаў загадаў: «Агонь! Мора агню!» Вядучы самалёт, які не паспеў увайсці ў пікіраванне, ад прамых трапанняў узарваўся разам з бомбамі. Два другіх самалёты, якія ляцелі блізка каля вядучага, атрымаўшы пашкоджанні, перавярнуліся і ўзарваліся. Перад самалётамі стала суцэльная завеса агню. Пераправа па-ранейшаму заставалася непашкоджанай.

З выццём сірэн атакуюць мост наступныя тройкі самалётаў. Батарэі вядуць агонь самастойна. Атрымаўшы старты, астатнія тройкі «Юнкерсаў» ужо на мост не пікіравалі, а скідвалі бомбы абы-як, не пападаючы ў цэль. Дзве-тры серыі бомбаў разарваліся ў раёне штаба палка. Ад прамога пападання разляцеўся штабны аўтамабіль. Капітан Клюйко і радавы Авакумаў забітыя. Рэшткі штабнога аўтамабіля і скрыні з боепрыпасамі гараць яркім полымем.

«А ў паветры адзін за адным развальваліся «Юнкерсы», падаючы з дымным следам. Батарэі не зніжаюць тэмпы агню. Умовы стральбы для батарэй добрыя: цэлі ў зоне агню, вышыня не менш за 2000 метраў, выдатая бачнасць, агнявыя пазіцыі не схільныя ўдару самалётаў, мэта якіх – мост разбіць.

Тут, на палянцы, у раёне падпаленай штабной машыны сталі разрывацца ад агню буйнакаліберныя патроны «ДДК», гараць і скрыні са снарадамі. Усе, хто апынуўся паблізу, кінуліся тушыць і расцягваць скрыні з боепрыпасамі. Шафёры выводзілі ў бяспечнае месца ўцалелыя аўтамашыны са снарадамі.

Камсамольцы Мікалай Варанцоў, Іван Гузяеў, повар Аўбекіраў Усман, парторг палка Міхаіл Дзерабін, а таксама Арзуманаў, Юнусаў шукалі сцяг палка. Нарэшце выцягнулі з-пад гарэўшых абломкаў аўтамашыны святыню палка. Чарговыя выбухі бомбаў. Забіты старэйшы лейтэнант Дзерабін Міхаіл Аляксеевіч, радавыя Шырокаў Аляксей Фёдаравіч, Земскіх М.І..

Свішчуць асколкі. Усё новыя і новыя ахвяры: Букоцін, Неўнылаў.

Паранена дзесяць воінаў. Сярод іх камандзір узвода Камінскі А.Ф., ваенфельчар лейтэнант медыцынскай службы Кашын М.С., радавыя Саладко Л.М., камсорг палка лейтэнант Крэмез Мікалай Васільевіч і старшы лейтэнант Субоцін Юрый Мікалаевіч ...Кідаюцца ад аднаго параненага да другога фельчар і санітарныя інструктары.».

Цішыня наступіла неяк нечакана, раптоўна, як і пякельны грукат у пачатку боя. Маёр Арзуманаў прынёс выратаваны сцяг палка. Камандзір палка на сёмым небе! На радасцях ён даў каманду: тэрмінова прадставіць маёра Арзуманава да ўзнагароды.

У час бою згарэла штабная машына «Студэбекер», але частка штабной дакументацыі выратавана. Штамп палка выбухной хваляй быў далёка адкінуты і знойдзены пісарамі. Асколкамі пашкоджаны два «Доджы» і яшчэ тры «Студэбекеры», выйшлі са строю тры кулямёты.

Пашкоджаная тэхніка і зброя пасля была адрамантавана сіламі палкавых майстраў.

У баі пры прыкрыцці маста зрасходавана 1006 снарадаў, 1300 патронаў ДШК. Полк збіў 6 самалётаў праціўніка.

Мост адстаялі. Войскі 2-га стралковага корпусу фарсіраваным маршам ішлі праз мост, выказваючы зенітчыкам удзячнасць.

Камандуючы артылерыяй корпусу даслаў адкрытым тэкстам падзяку.

Падчас бою ў палон былі захоплены тры лётчыкі. На пытанні перакладчыка, радавога Дворкіна з зенітна-кулямётнай роты, нямецкія

лётчыкі не адказвалі, а дэманстратыўна адвярнуліся. Падышоў магутны повар Аўбекіраў Усман. Яго погляд «развязаў» языкі немцаў, і яны паведамілі: «Наша авіягрупа ў складзе 27 самалётаў мела задачу разграміць танкавую калону глыбока ў тыле. Камандзір групы, цяпер ужо пакойны, убачыў калону пехацінцаў, якая рухалася па мосце і вырашыў знішчыць яе і мост таксама». А другі лётчык заявіў: «Вайну ведаю трэці год, а пад такі шчыльны агонь трапляю ўпершыню».

Ноччу варожыя самалеты бамбілі баявы парадак палка бомбамі тыпу «лягушка», а таксама скідвалі асвятляльныя і запальныя бомбы.

2 ліпеня ў 5 гадзін 15 хвілін дня полк адбіў новы налёт 18 «Ю-87» і 4 «ФВ-190», якія бамбілі мост з гарызантальнага палёту з вышыні 3000 метраў. Група варожых самалётаў была сустрэта магутным, сканцэнтраваны агнём зенітных батарэй.

У 14 гадзін 15 хвілін гэтага ж дня немцы ажыццявілі дэманстратыўны палёт і скінулі некалькі бомб за паўночнай мяжой зоны агню батарэй, спрабуючы заўважыць агнявыя пазіцыі палка.

Добрая зладжанасць гарматных нумараў і батарэй у цэлым, высокі маральны дух усяго асабістага саставу – усё гэта прадэманстравала высокую баявую сталасць палка. Пераправа засталася некранутай. Зенітчыкі выканалі сваю задачу.

На досвітку 3 ліпеня 1944 года ў цэнтры вёскі Германавічы былі пахаваныя загінуўшыя, а 1406 ЗАП рушыў далей, у Шаркаўшчыну.

Баявы шлях 1406 ЗАП – гэта невялікая частка гісторыі магутнай, несакрушальнай Чырвонай Арміі, якая процістаяла фашысцкай навале ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а бой з авіяцыяй праціўніка ў вёсцы Германавічы – маленькі эпізод.

Аб мужных і высакародных салдатах мінулай вайны Клюйко Макару Іванавічу, Прохараве Сяргею Міхайлавічу, Дзярабіне Міхаілу Алексеевічу, якія аддалі жыццё у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, аб іх лёсах, дастойных пераймання, памятаюць вяскоўцы зараз і, я ўпэўнена, што будуць памятаць праз гады. Іх лёсы – гэта прыклад мужнасці і любові да радзімы, вернасці салдацкай прысязе і самаахвярнасці.

Рашэннем райвыканкама ўвекавечана памяць аб вызваліцелях вёскі Германавічы. Прозвішчамі мужных зенітчыкаў М.І. Клюйко, С.М. Прохарава і М.А. Дзерабіна названы вуліцы ў Германавічах

## II. ІХ ІМЁНАМІ НАЗВАНЫ ВУЛІЦЫ ГЕРМАНАВІЧ

### МІХАІЛ АЛЯКСЕЕВІЧ ДЗЕРАБІН



Адна з самых прыгожых вуліц нашага аграгарадка – вуліца імя М.А. Дзерабіна. Калі запытацца ў яе жыхароў, чыё імя яна носіць, яны адразу адкажуць, што Міхаіл Аляксеевіч – зенітчык, які вызваляў нашу вёску ад нямецка-фашысцкіх акупантаў і загінуў. Ён пражыў нядоўгае, але вельмі змястоўнае жыццё.

Нарадзіўся Міхаіл Аляксеевіч у вёсцы Вусць-рака Архангельскай вобласці. Бацька Дзерабіна, Аляксей Лукіч, быў селянінам. Працаваў на зямлі, у лесе – на нарыхтоўцы драўніны. Маці – Аляксандра Пятроўна Дзерабіна – дамашняя гаспадыня. У сям'і Дзерабіных было сем дзяцей, Міхаіл – старэйшы з іх. Жыць было цяжка, у школу хадзілі за некалькі кіламетраў у вёску Піншчуну. Жаданне вучыцца было вялікае, але патрэбна было шмат працаваць, так як з 12 гадоў замяняў бацьку, але тым не менш ён скончыў школу, лясны тэхнікум, працаваў лесарубам, начальнікам лясгаса. Вельмі добра ведаў сваю справу, любіў паэзію, быў прыкладам для сяброў, якіх было шмат. Аднапалчане запомнілі Міхаіла Аляксеевіча такім: «Вочы шэрыя, то ўважлівыя, то смяшлівыя. Валасы русыя, кучаравыя, твар шырокі, губы тонкія, усмешлівыя».

Міхаіл Аляксеевіч, калі служыў у арміі, вучыўся ў Ленінградскай артылерыйскай школе, дзе быў агітатарам, актывістам, камандзірам узвода. Усе гэтыя якасці спатрэбіліся яму ў далейшым жыцці. Пасля армейскай службы Міхаіл Аляксеевіч працаваў старшынёй калгаса, яму давялося перажыць смерць жонкі, якая пакінула яму двух дачок Валянціну і Алю, а ад другога шлюбу у яго быў сын Мікалай.

Мірнае жыццё перарвала вайна і Дзерабін Міхаіл Аляксеевіч падаў заяву з просьбай паслаць яго на фронт. Яго прызначылі на пасаду паручэнца начальніка палітупраўлення арміі. За баі пад Масквой быў узнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны. Салдаты і афіцэры 1406 зенітна-артылерыйскага палка, дзе ён служыў парторгам, паважалі Міхаіла Аляксеевіча за справядлівасць і чалавечнасць, храбрасць і мужнасць. Ён гаварыў сваім падначаленым: «Майстэрства і жыццё цесна звязаныя» і заўсёды пісаў пісьмы бацькам зенітчыкаў, дзеці якіх за храбрасць і мужнасць ўзнагароджваліся ордэнамі і медалямі.

З 26 мая па 3 чэрвеня 1944 года Дзерабіну пашчаслівілася пабываць дома, пабачыцца з роднымі. Ён, як бы назаўсёды развітаўся з імі, бо праз

месяц 1 ліпеня 1944 года загінуў пры вызваленні вёскі Германавічы ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Было на той час Дзярабіну Міхаілу Аляксеевічу 34 гады. Дома яго чакалі жонка, дзве дачкі і малодшы сын.






*Вуліца Дзерабіна аграгарадка Германавічы*

## СЯРГЕЯ МІХАЙЛАВІЧ ПРОХАРАЎ



Імя вялікага чалавека Сяргея Міхайлавіча Прохарава носіць невялікая і адна з самых маладых вуліц нашага аграгарадка. Магчыма таму яе першая назва Маладзёжная. Вуліца і зараз пашырае свае межы. У новыя дамы пераязджаюць маладыя сем'і, таму яна заўсёды абнаўляецца.

Тут жывуць прадстаўнікі розных прафесій. Вуліца па-свойму цікавая, мне падабаецца назіраць за яе насельнікамі, якія зранку да вечара занятыя рознымі вясковымі справамі. І цяжка паверыць, што некалі тут грымелі баі, ішла вайна, гінулі людзі. Як напамін пра гэта, асколкі бомб і снарадаў, што да сённяшняга часу захаваліся ў германавіцкай зямлі.

Прохараў Сяргей Міхайлавіч нарадзіўся 15 ліпеня 1921 года ў в. Думінічы, Думінічскага раёна, Калужскай вобласці ў сям'і беднага селяніна. У 1938 годзе закончыў Думінічскую сярэднюю школу і курсы настаўнікаў пры Казельскім педагагічным вучылішчы. З верасня 1938 года, да прызыву ў армію, працаваў настаўнікам.

10 кастрычніка 1939 года быў напраўлены ў ПО стралковы полк Забайкальскага ваеннага округа. З лютага па сакавік 1940 года знаходзіўся на

Фінскім фронце ў першым асобным лыжным батальёне аўтаматчыкаў. З жніўня 1940 года да жніўня 1941 года вучыўся ў Чкалаўскім вучылішчы зенітнай артылерыі. У жніўні 1941 года Сяргей Міхайлавіч Прохараў атрымаў званне лейтэнанта і яго направілі ў 669 полк камандзірам батарэі, у складзе якой прымаў удзел у баявых дзеяннях на Калінінскім фронце. «Ён быў дысцыплінаваным, смелым камандзірам, ведаў і любіў сваю справу. Нястомнай працай і ўмелым камандаваннем Прохараў выхоўваў у салдат жалезную воінскую дысцыпліну і баявую зладжанасць, чым у баявых дзеяннях палка забяспечваў паспяховае выкананне задач. За перыяд наступальных аперацый, асабліва ў моманты цяжкіх баёў, батарэя паказвала ўзоры мужнасці і адвагі. Прохараў быў патрабавальным да сябе і да падначаленых» За мужнасць і адвагу, праяўленую ў баях, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, ордэнам Аляксандра Неўскага.

6 сакавіка 1942 года Сяргей Міхайлавіч быў паранены і да 15 мая 1942 года знаходзіўся на лячэнні ў г. Іванава. Потым праходзіў службу ў 145 запасным стралковым палку Калінінскага фронту намеснікам камандзіра стралковай роты. У 1942 годзе яго прызначылі камандзірам роты. Да лютага 1943 года ён знаходзіўся ў рэзерве камандуючага артылерыяй Чырвонай Арміі пры 52 запасным артылерыйскім палку Калінінскага фронту.

У 1943 годзе Прохараў прызначаны камандзірам батарэі 1406 зенітна-артылерыйскага палка, 39 зенітна-артылерыйскай дывізіі. Разам з палком прайшоў з баямі ад Смаленска да Балтыкі. Начальнік штаба 1406 ЗАП Нізоўцаў Анотоль Іванавіч успамінае аб Прохараве: «Маё знаёмства з ім адбылося ў працэсе праверкі. Гэта быў малады камандзір, які да таго часу меў ужо пэўны вопыт у камандаванні падраздзяленнем палка, адчувалася граматная рука ў выхаванні воінаў. На зададзеныя пытанні адказваў бойка, але не вельмі любіў гаварыць, адкажа і маўчыць, як быццам бы ўзвешваў правільнасць сваіх думак. Па характары – валявы, смелы, але замкнуты таварыш». Пасля вайны Сяргея Міхалавіча накіравалі ў Прыморскую ваенную акругу. Два гады (1955-1957) знаходзіўся на пасадзе намесніка камандзіра 715 ЗАП 14 зенітна-артылерыйскай дывізіі Паўночнай ваеннай акругі. Потым – вучоба ў г. Семфіропалі на Цэнтральных зенітных артылерыйскіх афіцэрскіх курсах. Апошняе месца службы Прохарава С.М. – Адэская ваенная акруга, дзе ён служыў намеснікам камандзіра 1872 ЗАП.


*Вуліца Прохарава аграгарадка Германавічы*

Сяргей Міхайлавіч унёс вялікі ўклад у стварэнне музея 1406 ЗАП у Германавіцкай

сярэдняй школе і арганізацыю сустрэч з ветэранамі палка. Яго паважалі і любілі ў палку, да яго думкі прыслухоўваліся ветэраны, добра запомніўся ён таксама і вяскоўцам старэйшага пакалення. Нечакана пасля апошняй сустрэчы са сваімі аднапалчанамі ў 1985 годзе Прохараў памёр. Ветэраны 1406 ЗАП звярнуліся да выканкама Германавіцкага сельскага Савета з просьбай аб прысваенні адной з вуліц вёскі імя Сяргея Міхайлавіча Прохарава.

## МАКАР ІВАНАВІЧ КЛЮЙКО



Вуліца Клюйко пачала забудоўвацца ў канцы 1970-х гадоў. Яна і цяпер пашыраецца. Зусім нядаўна тут былі пабудаваны дзесяць новых, прыгожых, сучасных дамоў для працаўнікоў ААТ «Княж». На адным з дамоў размешчана шыльда, на якой кароценькія звесткі аб Макары Іванавічы Клюйко, і мне, канешне, хацелася даведацца больш пра чалавека, імя якога носіць гэта вуліца.

Макар Іванавіч нарадзіўся ў 1914 годзе ў вёсцы Голацк Голацкага сельскага Савета Рудзенскага (зараз Пухавіцкага) раёна Мінскай вобласці ў сям'і беднага селяніна. Час быў цяжкі, ішла першая сусветная вайна. Макар хацеў вучыцца, ён з задавальненнем пайшоў у школу. Быў добрым вучнем і сынам.

У 1926 годзе Макар Іванавіч скончыў вясковую пачатковую школу, а ў 1929 годзе – сем класаў Дукорскай сярэдняй школы і стаў студэнтам Мінскага фінансава-эканамічнага тэхнікума. Ён хацеў хутчэй стаць незалежным і дапамагаць родным. У 1935 годзе закончыў тэхнікум і быў напраўлены на працу ў Брэсцкі раён старшым налогавым інспектарам. У гэтым жа годзе Макара Іванавіча прызвалі ў Чырвоную Армію і служыў ён у 297 ЗАП у Магілёве, а ў 1938 годзе атрымаў дакумент аб заканчэнні зенітна-артылерыйскага вучылішча з прысваеннем звання малодшага лейтэнанта. У 1939 годзе малодшы лейтэнант прымае актыўны ўдзел у вызваленні народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, затым служыць у горадзе Бабруйску, а праз год атрымлівае назначэнне ў Прыбалтыку. Потым – курсы ўдасканальвання зенітчыкаў у горадзе Еўпаторыі Крымскай АССР і назначэнне ў Баранавічы ў 297 ЗАП. У першыя дні вайны полк быў разбіты. Вайна бязлітаснай рукой правяла тую рыску, за якой засталіся мірныя спадзяванні і турботы, адрэзала ад сваіх: у Голацку ў яго бацькоў засталіся жонка Дуся і сын Валодзя, якому яшчэ не споўнілася і годзіка. Зноў на фронт Макар Іванавіч прыбыў у складзе 1406 ЗАП. Бясконцыя баі, год за годам вайна. Ён узначальваў перадавы атрад для выканання аперацыі па вызваленні Германавіч. Дзякуючы разумным рашучым дзеянням Клюйко Макара

Іванавіча, яго асабістай адвазе, праяўленай у гэтым баі, полк выканаў сваю задачу.

Гэта быў апошні бой для Макара Іванавіча. Да вызвалення Беларусі заставаліся лічаныя дні. Напярэдадні апошняга свайго бою Макар Іванавіч у радасным чаканні гаварыў сваім таварышам аб тым, што хутка ўбачыць сваіх родных. Замест доўгачаканай сустрэчы родныя атрымалі пахаванку.






*Вуліца Клюйко аграгарадка Германавічы*

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Памяць пра вайну – асноўны сэнс дадзенай працы. Чым далей у мінулае адыходзіць Вялікая Айчынная вайна, тым больш значным становіцца подзвіг народа, які адстаяў свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы, разграміў ворага, унёс рашаючы ўклад у пазбаўленне чалавецтва ад пагрозы фашысцкага зняволення. Тысячамі нябачных, жывых і трывалых нітак мінулае звязана з сённяшнім і заўтрашнім днём.

Нам, маладому пакаленню, нават уявіць вайну па-сапраўднаму вельмі цяжка. Наш абавязак – памятаць аб тых, хто выратаваў Радзіму ад ворага. Памяць аб вайне будзе пераходзіць ад бацькоў да сыноў, ад сыноў да ўнукаў. Інакш нельга.

Услухаемся ў бясхітрасныя ўспаміны ветэранаў, у думках разам з імі пройдзем шляхамі ваенных ліхалеццяў, усвядомім велічнасць іх лёсу, каб памятаць …

Наш святы абавязак – увекавечыць імя кожнага, хто змагаўся на вайне.

## Спіс літаратуры

1. Грымоты над Дзісной: з успамінаў ветэрана 1406-га зенітна-артылерыйскага палка П.Ц. Вастракова // Памяць: Гіст-дакум. Хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мн.: БЕЛТА, 2004. – С.234-235.

2. Кожан, К. Баявы шлях палка / К. Кожан // Кліч Радзімы. – 2004. – 23 чэрв. – С.5

3. Матэрыялы пакоя баявой славы 1406 ЗАП. Гісторыка-краязнаўчы музей Германавіцкай сярэдняй школы.




*Схема бою 1406 ЗАП з авіяцыяй праціўніка*



*Асколак бомбы, скінутай на Германавічы*




*Помнік-зенітка ў гонар воінаў 1406 ЗАП*




*Ветэраны 1403 ЗАП каля помніка-зеніткі*